# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

12 жніўня 2015 г.
№ 15 (355)


ТЭНДЭНЦЫЯ

## ЗВАРОТАЎ СТАНОВІЦЦА МЕНШ,

### бо многія праблемныя пытанні ўжо вырашаны

Барыс ПРАКОПЧЫК

**Суботнія «прамыя лініі» тэлефоннай сувязі грамадзян з кіруючымі работнікамі Гродзенскай вобласці ўжо пасадзейнічалі вырашэнню многіх праблемных пытанняў. І таму званкоў становіцца менш. Ды і ўвогуле, захоўваецца тэндэнцыя скарачэння зваротаў як у аблвыканкам, так і ў мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы.**



— Гэта вынік таго, што прымаюцца меры па вырашэнні сацыяльна значных пытанняў насельніцтва, праводзіцца тлумачальная работа з людзьмі, — адзначае **начальнік аддзела па рабоце са зваротамі Гродзенскага аблвыканкама Кацярына ФЕДАСЕНКА.**

Напрыклад, ужо тройчы «прамыя лініі» праводзіў па суботах **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ**. Падчас першай, у студзені, да яго звярнуліся па 36 пытаннях, у сакавіку — па 24, у маі — па 13. Колькасць ахвотных дазваніцца на «прамую лінію» значна скарацілася. Усе звароты разгледжаны, і шэраг узнятых праблем ужо вырашылі. У прыватнасці, гродзенцы з вуліцы Чыгуначнай звярталіся наконт аднаўлення асфальтавага пакрыцця пасля работ па пракладцы цеплатрасы. Па даручэнні старшыні аблвыканкама гэта аператыўна выканалі.

— Улада стала значна больш дступнай. Таму колькасць зваротаў і далей будзе скарачацца. Гэта ў пэўным сэнсе індыкатар таго, як мы працуем з людзьмі, як адгукаемся на праблемныя пытанні і як іх вырашаем, — лічыць **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК.**

З іншага боку, многіх зваротаў да кіраўнікоў вобласці магло б не быць, калі б гэтыя заяўнікі добра ведалі нормы заканадаўства. Найперш — прэзідэнцкі Указ №498 «Аб дадатковых мерах па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб», дзе дакладна вызначана, у чыёй кампетэнцыі вырашэнне тых ці іншых пытанняў. Ды і ўтрыманства хапае — у тым сэнсе, што некаторыя пальцам не паварушаць, каб нешта зрабіць самім. Хаця няўжо, напрыклад, за ўтварэнне стыхійнай смеццевай звалкі ў населеным пункце павінна адказваць улада, а не тутэйшыя жыхары? Пэўна, трэба не сігналізаваць у аблвыканкам, а самім навесці парадак і разам з прадстаўнікамі мясцовага самакіравання паклапаціцца (пры дапамозе растлумачальнай работы і штрафных санкцый), каб больш не смецілі?

> Улада стала значна больш даступнай. Таму колькасць зваротаў і далей будзе скарачацца.

Ужо традыцыйна пераважная частка зваротаў грамадзян у органы ўлады тычыцца рамонту і добраўпарадкавання жылля, дваровых тэрыторый, дарог. І практычна заўсёды на гэта патрабуюцца дзяржаўныя сродкі. А іх, вядома ж, шмат ніколі не бывае. Зразумела, што адразу ўсё выканаць немагчыма, бо бюджэтнае фінансаванне на тыя ці іншыя праграмы выдзяляецца ў планавым парадку.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)



Яўген Аляксеевіч і Алена Мікалаеўна, як ніхто іншы, ведаюць гісторыю сваёй вёскі.

І МЫ ТАМ БЫЛІ!

## КАРАНЯМІ ЎГЛЫБ СТАГОДДЗЯЎ

### Вёска Корань, што на Лагойшчыне, адсвяткавала 620 гадоў з дня заснавання

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

**Бадай, няма ў Корані чалавека, які б ведаў гісторыю гэтага населенага пункта лепш, чым былыя настаўнікі Алена і Яўген Пажарыцкія. Перасяліліся яны сюды ў далёкім 1969-м. Пасля заканчэння Аршанскага педагагічнага вучылішча шэсць гадоў адпрацавалі ў Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці, але, як прызналася гаспадыня, пацягнула на малую радзіму (нарадзілася непадалёку, у Плешчаніцах).**

— Корань — прыгожая, сучасная вёска. Але яе карані прараслі ўглыб стагоддзяў. Як сведчыць легенда, некалі на гэтым месцы рос густы лес. І толькі на невялікім узвышшы віднеўся чысты лапік зямлі. Вось тут і пасяліліся першыя жыхары. Паціху пачалі адваёўваць кожную пядзю зямлі: карчавалі пні, выдзіралі шчыльна пераплеценыя паміж сабой карані. І сталі называць гэтых людзей коранцамі, а паселішча — Корань. Нездарма тут шмат жыхароў маюць прозвішча Карэнскія, — распавяла Алена Мікалаеўна.

Упершыню Корань згадваецца ў акце, напісаным на лацінскай мове 2 лютага 1395 года, дзе вялікі князь Вітаўт дорыць кафедральнаму касцёлу ў Вільні шэраг новых уладанняў. Сярод іх тры паселішчы з людзьмі на тэрыторыі сучаснага Лагойскага раёна: Корань, Ганявічы і Волча. Усяго ж існуе каля 500 сведчанняў гісторыі паселішча.



Фота Сяргея Нікановіча.

#### Дождж на Святога Антонія

— Корань славіцца тым, што тут ладзяць свята ў гонар Святога Антонія. На дзіва, наша вёска каталіцкая, у той час, як усе вакол яе — праваслаўныя. Старажылы расказвалі, што везлі абраз Святога Антонія ў Хатавічы (цяпер Кастрычнік), ды коні сталі каля касцёла ў Корані як укопаныя, іх не маглі зрушыць з месца... На жаль, храм быў разбураны падчас Вялікай Айчыннай вайны. Людзі кажуць, тых, хто яго руйнаваў, пакараў Бог. Цяпер жа касцёл месціцца ў прыстасаваным памяшканні, — працягвае Алена Мікалаеўна. — Калі пераехалі ў Корань, мяне вельмі зацікавіла гэтае свята. Людзі ішлі на тое месца, дзе калісьці знаходзілася святыня, і маліліся. Мяне здзіўляла і нават уражвала, што адтуль яны на каленях ішлі на могілкі... Цяпер збіраецца таксама шмат людзей, каб наведаць магілы сваіх продкаў, памаліцца за іх. Колькі сябе помню, на Антонія ідзе дождж. Гэта прыкмецілі ўсе жыхары.

— Ці адрозніваюцца коранцы ад жыхароў навакольных вёсак? — пацікавілася ў Алены Мікалаеўны.

— Вельмі яны музыкальныя, добразычлівыя, прыязныя, адкрытыя, лёгка ідуць на кантакт, — запэўніла мая суразмоўца.



— А яшчэ працавітыя, — дадае Яўген Аляксеевіч. — У нашай школе былі настаўнікі — муж і жонка. Паехалі яны да сваякоў у Ізраіль. Глядзіць наша Ларыса, а там дзівосныя фрукты валяюцца літаральна пад нагамі. Як жа так, столькі дабра прападае? Дык яна давай ставіць кампоты ды варэнне варыць...

#### Ганарымся сваімі!..

— Наша вёска не збіраецца паміраць, — сцвярджае Яўген Аляксеевіч. Аграгарадок Корань — гэта 141 двор, 375 жыхароў, у мясцовай школе вучыцца 100 дзяцей, яшчэ 25 ходзяць у садок. У нас ёсць усё неабходнае для жыцця: Дом культуры, бібліятэка, пошта, амбулаторыя, крама, камбінат бытавога абслугоўвання і нават падведзена «блакітнае» паліва, ад якога цёпла і ўтульна ў многіх дамах. А самае галоўнае, хапае рабочых месцаў для людзей. Коранцы, можна сказаць, адна вялікая сям'я.

Гэта яшчэ раз пацвердзіла свята вёскі. Усе, як адзін, жыхары выйшлі «на суботнік»: парадкавалі падворкі, вуліцы, абкошвалі траву, саджалі дрэвы і кветкі, фарбавалі агароджы. Тыя, хто працуе ва ўстановах, арганізацыях, таксама наводзілі «бляск» каля будынкаў.

— На грамадзянскіх могілках часткова замянілі агароджу, пафарбавалі помнікі на брацкай магіле, у месцах пахавання землякоў, што загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны, добраўпарадкавалі тэрыторыі агульнага карыстання, — дадае старшыня Гайненскага сельскага Савета Андрэй Свібовіч.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

## ЁСЦЬ КАНТАКТ

### Многіх выбаршчыкаў наш сённяшні суразмоўца ведае асабіста



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Гэта і не дзіўна: Алег ЛЕЎШУНОЎ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях, не толькі рэгулярна сустракаецца з жыхарамі сваёй выбарчай акругі, але і з'яўляецца ініцыятарам шматлікіх акцый. Пра тое, з якімі просьбамі і прапановамі прыходзяць да яго людзі і якія праекты ён рэалізуе ў Гомельскай-Цэнтральнай выбарчай акрузе №33, Алег Леўшуноў расказаў «Звяздзе».**

— Калі казаць пра характар пытанняў, то яны датычацца і жыллёва-камунальнай гаспадаркі, і аховы здароўя, і сацыяльнага забеспячэння... За першае паўгоддзе праведзена 7 прыёмаў грамадзян, а таксама 22 сустрэчы з выбаршчыкамі ў працоўных калектывах. Усяго разгледжана 43 пісьмовыя і вусныя звароты.

***— Якія праблемы ўдалося вырашыць?***

— Інвалід-калясачнік Пётр Ільіч Тарун звяртаўся да нас па пытанні безбар'ернага асяроддзя. Яму трэба было пашырыць дзверы ў некаторых пакоях кватэры, таму што праект не прадугледжвае праезду каляскі ў ванны пакой. Я звязаўся з адміністрацыяй раёна, мы знайшлі спонсара і зрабілі праём, які дае магчымасць інваліду перамяшчацца без перашкод. Другое пытанне, з якім звяртаўся той жа чалавек, — усталяванне пад'ёмніка. Гэта вельмі затратна, таму мы пакуль не дапамаглі яму.

Такіх прыкладаў можна прывесці шмат. Ёсць неаднаразовыя звароты жыхара нашага горада Андрэя Гар'евіча Аксёнава. Ён узнімае пытанні добраўпарадкавання тратуараў, усталявання парэнчаў ля спуску да ракі, бардзюраў на аўтобусных прыпынках і лавак у шматлюдных месцах. Многае мы разам з органамі мясцовай улады вырашылі. Аксёнаў пасля прыйшоў у адміністрацыю раёна і напісаў падзяку, у тым ліку і дэпутату. Гэты чалавек з'яўляецца актыўным удзельнікам грамадзянскай кампаніі «Наш дом».

> Як дэпутат, я магу падняць пэўную праблему і звярнуцца да тых ці іншых службовых асоб. Нас чуюць, ідуць насустрач і дапамагаюць.

Адзін выбаршчык звяртаўся да нас, каб дапамаглі яго маці атрымаць іншую групу інваліднасці. Яна мела другую групу, але па стане здароўя была неабходнасць устанавіць першую. Сын з маці звярталіся ў адпаведныя інстанцыі, але пытанне чамусьці не вырашалася. Пасля майго запыту ў органы дзяржаўнай улады, што адказваюць за ахову здароўя, была праведзена экспертыза і пажыццёва ўстаноўлена першая група інваліднасці.

Вельмі цеснае супрацоўніцтва склалася з Асацыяцыяй сем'яў дзяцей-інвалідаў і маладых інвалідаў з дзіцячым цэрэбральным паралічом і спінна-мазгавымі паталогіямі. У рамках акцыі «Нашы дзеці» ў канцы мінулага года мы з маімі памочнікамі арганізавалі святочнае мерапрыемства. Каб зрабіць яго цікавым для дзяцей, запрасілі артыстаў з гомельскага цырка. Арганізавалі салодкія падарункі — тут дапамагло наша прадпрыемства «Спартак». Пасля мы паехалі наведаць тых дзяцей, што не змаглі прыняць удзел у свяце. У выніку выявіўся шэраг праблем, якія тэрмінова трэба было вырашаць. Некаторым дзецям неабходны былі каляскі для перамяшчэння. Органы мясцовай улады па магчымасці дапамаглі ў свой час, але ж дзеці растуць, і, адпаведна, штогод ім патрэбны новыя каляскі. Мы дапамаглі Мікіту Сароку і Дашы Кадыш. Дашы мыдасталі спецыяльную прагулачную каляску. Мікіта ж амаль не можа рухацца, і яму патрэбна была стойка-вертыкалізатар, каб ён хаця б мог трымацца на нагах. Мы дапамаглі яму і ўручылі яго сям'і неабходнае абсталяванне.

***— Як вы кантактуеце з дэпутатамі мясцовых Саветаў?***

— У нас вельмі цеснае супрацоўніцтва з органамі мясцовага самакіравання. У гэтым годзе я прыняў удзел у чатырох пасяджэннях гарадскога і абласнога Саветаў дэпутатаў і трох пасяджэннях гарадскога выканаўчага камітэта. Як дэпутат, я магу падняць пэўную праблему падчас пасяджэння таго ці іншага выканаўчага органа і звярнуцца да тых ці іншых службовых асоб. Нас чуюць, ідуць насустрач і дапамагаюць.

Што да сумеснай працы з дэпутатамі мясцовага ўзроўню, то гэтае ўзаемадзеянне таксама мае шмат кірункаў. Напрыклад, праводзіўся семінар «Роль органаў мясцовага самакіравання». У ім прымалі ўдзел і кіраўнікі домаўладанняў, і Савет старэйшын, і проста жыхары запрашаліся, абмяркоўваліся набалелыя пытанні: і добраўпарадкаванне, і рамонт жылля, і дапамога адзінокім людзям.

Мы ведаем, што гэты год кіраўніком дзяржавы аб'яўлены Годам моладзі, акрамя таго, ён праходзіць пад знакам 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Мне, як воіну-інтэрнацыяналісту, унуку ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, тэма таксама блізкая. Мной была аб'яўлена акцыя пад назвай «Вялікая Перамога — вечная памяць» (пра адзін з яе этапаў «Звязда» пісала ў сакавіку. — **Аўт.**), да ўдзелу ў ёй былі запрошаны дэпутаты мясцовых Саветаў. Яны адгукнуліся. Акцыя была аб'яўлена ў сакавіку і працягваецца дагэтуль. Яна мае шмат этапаў. Гэта і пасадка чырвоных дубоў у цэнтры Гомеля ў гонар тых, хто не вярнуўся з вайны, і наведванне Палаты прадстаўнікоў, і паездка па месцах баявой славы Гомельшчыны (мы ехалі па маршруце Гомель — Рэчыца — Лоеў — Брагін — Гомель)... У акцыі таксама прынялі ўдзел ветэраны, школьнікі, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў «Белая Русь» і «БРСМ», журналісты, ветэраны вайны ў Афганістане, прадстаўнікі раённых аддзелаў адукацыі, а таксама мае калегі — дэпутаты Палаты прадстаўнікоў з тых гарадоў, якія наведалі. Мы ўскладалі кветкі, гутарылі з ветэранамі. Па выніках паездкі было вельмі шмат станоўчых водгукаў: сапраўды, трэба як мага больш даведвацца пра сваю радзіму і памятаць герояў, якія аддалі жыццё за той край, дзе мы жывём.

***— Вы расказалі пра акцыю, прысвечаную Дню Перамогі «Вялікая Перамога — вечная памяць». А якія яшчэ акцыі вы праводзіце ў сваёй акрузе?***

— Разам з адміністрацыяй Цэнтральнага раёна Гомеля штогод праводзяцца турніры па валейболе ў гонар памяці майстра спорту Савецкага Саюза Аляксандра Падасінава. Яшчэ адна акцыя, у якой я непасрэдна ўдзельнічаю, — гэта «Збяры партфель першакласніку». Праводзіўся конкурс навукова-творчых работ школьнікаў «Вайна ў лёсе маёй сям'і», па выніках яго найлепшыя працы былі надрукаваны ў «Гомельскім весніку». Гэта толькі некаторыя з акцый, якія праводзяцца ў маёй акрузе.

Увогуле, я вельмі ўдзячны органам мясцовай улады, грамадскім аб'яднанням, у прыватнасці Беларускаму саюзу ветэранаў вайны ў Афганістане, за дапамогу і падтрымку. Спадзяюся, наша супрацоўніцтва будзе плённым і надалей.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
yushkevich@zviazda.by

ЗУСІМ НЕСАКРЭТНА

## «Я ДОБРА ВАЛОДАЮ СТАНОВІШЧАМ, МЯНЕ НЕ ПАДМАНЕШ»

**Старшыня Клімавіцкага раённага Савета дэпутатаў Мікалай ДАЛГУН — пра добрасуседскія сувязі з Расіяй, барацьбу з лайдакамі і вясковыя клопаты.**



...Ад Клімавіч да мяжы з Расіяй — рукой падаць: лічы, свае людзі там жывуць, а жыхары прыгранічных вёсак наогул пешшу адно да аднаго ў госці ходзяць.

***— Як вы падтрымліваеце сувязі са сваімі калегамі з Расіі?***

— Сябруем, ездзім на святы, праводзім сумесныя спартыўныя спаборніцтвы... З Шумячамі наогул гадоў каля 30 падтрымліваем адносіны. Я там, лічы, ганаровы грамадзянін, узначальваю нашы дэлегацыі. Мы пастаянныя госці на іх міжнародным фестывалі самадзейнай мастацкай творчасці «Памежжа», які святкуецца ў чэрвені. У нас вельмі моцныя творчыя калектывы, і мы нават некалькі разоў гран-пры бралі. На жаль, сёлета не было магчымасці паўдзельнічаць. Затое яны на наш міжнародны фестываль дзіцячай творчасці «Залатая пчолка» прыязджалі, нават крыху зайздросцілі, што мы так добра ўсё арганізавалі.

***— Вы дэпутат са шматгадовым вопытам. Можаце параўнаць, як раней працавалася народным абраннікам і як сёння?***

— Наогул я па прафесіі будаўнік. Працаваў галоўным інжынерам Клімавіцкай ПМК-256, потым узначаліў ДСП ПМК-9. Дэпутатам гарадскога Савета быў з 25 гадоў. Тыя ж пытанні вырашаў, што і цяпер: і пра чысціню горада думалі, і пра жыллё. У тыя часы на добраўпарадкаванне столькі грошай выдзялялася, што не паспявалі асвойваць. Той асфальт, што цяпер ляжыць у горадзе, на 80% зроблены нашым ДСП ПМК-9. Сёння наш бюджэт на 70% датуецца. А калісьці мы ўвогуле абыходзіліся без датацый.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

НА СЛЫХУ

## Ё-МАЁ! А СМЕЦЦЕ ЧЫЁ?..

### Гомель вось ужо некалькі гадоў жыве без такой вынаходкі мінулага стагоддзя, як смеццеправод

Ірына АСТАШКЕВІЧ

**Больш за тое, мае шматлікія знаёмыя, якія жывуць у шматпавярховіках, не адразу разумелі, пра што іх пытаю. «Які смеццеправод? Гэта той пакойчык, дзе ў нас бульба захоўваецца? Так, ёсць. Некаторыя там веласіпеды ставяць. Іншыя — каляскі».**

Усё, размова вычарпана. Забылі пра сумніўную зручнасць, водар гніення і хлоркі, прусакоў і пацукоў, пажары ад недакуркаў і грукат сярод ночы. Зніклі гэтыя з'явы з жыцця, быццам і не было ўвогуле.

> Апошні смеццеправод у Гомелі заварылі гадоў пяць таму, і сёння ў горадзе ўвогуле не засталося дамоў, дзе працуюць смеццеправоды.

Валерый Растокін, які працуе начальнікам жыллёвага аддзела ўнітарнага прадпрыемства «Гомельская гарадская ЖКГ» на працягу апошніх пятнаццаці гадоў, нават не ўзгадае, калі дакладна было прынята тое рашэнне гарадскога Савета дэпутатаў, згодна з якім смеццеправоды ў шматпавярховіках перасталі выкарыстоўвацца. Дзесці ў сярэдзіне 1990-х. Пытаюся, ці былі скаргі.

— Былі, але не больш за дзясятак за ўвесь тэрмін маёй работы на гэтай пасадзе. У кагосьці ногі хворыя або маці старая. Казалі: смеццеправод пабудавалі, я за яго грошы плаціў, таму няхай будзе... Але цяпер ніхто не скардзіцца. Апошні смеццеправод у Гомелі заварылі гадоў пяць таму, і сёння ў горадзе ўвогуле не засталося дамоў, дзе працуюць смеццеправоды. Нават тэхнікі, якая іх абслугоўвала, ужо даўно няма. Сёння мы набываем тую, што прыстасаваная пад так званыя еўракантэйнеры, якія маюць накрыўкі. Пры пагрузцы смецце практычна не высыпаецца. Кантэйнер падкатваецца да машыны, тая сама адкрывае накрыўку і справа зроблена.





Тым часам на апошняй сесіі Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў было прынята рашэнне: амаль Br8 мільярдаў накіраваць на павелічэнне статутных фондаў прадпрыемстваў, падведамасных Гомельскай гарадской ЖКГ. Палова з іх будзе накіравана камунальнаму ўнітарнаму прадпрыемству «Спецкамунтранс» менавіта на закуп еўракантэйнераў для збору цвёрдых бытавых адходаў і смеццявоза з задняй загрузкай.

Цяпер у горадзе над Сожам ёсць 1600 такіх еўракантэйнераў, з іх 750 было набыта летась. Сёлета плануецца закупіць яшчэ 700. Такім чынам, у горадзе будуць эксплуатавацца 2300 еўракантэйнераў, што павінна значна палепшыць санітарны стан і эстэтычны выгляд дваровых тэрыторый. Таксама ўжо за ўласныя сродкі прадпрыемства плануе закупіць дадатковыя смеццявозы.

Што тычыцца смеццеправодаў у новабудоўлях, Валерый Растокін кажа, што ўжо атрыманы дазвол Міністэрства будаўніцтва і архітэктуры: іх у пад'ездах не будзе. У выніку не трэба рабіць апытанне сярод жыхароў наконт таго, ці гатовы яны адмовіцца ад выкарыстання смеццеправода. Няма «аб'екта» — няма праблем.

Іншая задача, якая пакуль вырашаецца з вялікімі цяжкасцямі — раздзельны збор смецця. Сацыяльная рэклама ўздзейнічае на невялікую частку людзей, якіх можна назваць свядомымі. Гэта яны ў сінюю скрыню кідаюць шкляныя бутэлькі, а ў жоўтую — пластыкавыя. Іншыя адходы — у акуратным пакеціку — у металічна-шэрыя кантэйнеры. Але ж гэтаму ідэалу большасць пакуль не адпавядае.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)